этнические белорусы были вынуждены чётко отграничить себя от тех и других, чтобы сохранить свою самобытность соответственно критериям справедливости; сам термин «Беларусь» начал широко использоваться и наполнился новым содержанием в контексте процессов зарождения национальной литературы на белорусском языке и с появлением специализированных этнографических исследований (М.В. Довнар-Запольский и др.). Так в 1891 г. Ф. Богушевич опубликовал в Кракове сборник «Дудка белорусская» (под псевдонимом Матей Бурачок), а в 1894 г. в Познани «Смык белорусский» (псевдоним – Сымон Ревка). В 1903 г. издал свои стихотворения Янка Лучина (Неслуховский); можно также привести таких авторов – «белорусов», как Адам Гуринович, Казимир Костровицкий (Карусь Каганец), Ольгерд Обухович, Якуб Колос, Янка Купала.

Указанные процессы продолжались и в дальнейшем, предопределили обретение белорусами собственной государственности в современных условиях. При этом моральный фактор справедливости неизменно выступает катализатором национального самосознания в истории Беларуси.

**Использованная литература**

1. Суліма. «Гэтым пераможаш! …» (Нарысы крытычнага аптымізму) // Заходняя Беларусь: Зборник. Кн.1. – Вільня, 1923. – 123 с.

2. Довнар-Запольский М.В. История Белоруссии. – Минск: Беларусь, 2003. – 680 с.

3. Станкевіч А. З Богам да Беларусі: Збор твораў. – Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2008. – 1097 с.

## Рэлігійныя абшчыны нацыянальных меншасцей ў перыяд станаўлення і развіцця БССР (1920–1930-я гг.)

Пушкін І. А. г. Магілеў,
Магілёўскі дзяржаўны універсітэт харчавання

Савецкая нацыянальная палітыка характарызавалася тым, што, з аднаго боку, яна прызнавала факт існавання нацый і народаў у СССР і ў пэўнай ступені садзейнічала іх развіццю ў межах савецкіх рэспублік, а з другога – і гэта было асноўнай, праграмнай,

перспектыўнай задачай – праводзілася палітыка на зліццё нацый і народнасцей, нівеліроўку іх нацыянальных асаблівасцей. Больш за тое, вялікая ўвага надавалася з боку кампартыі і дзяржавы фарміраванню савецкага народа як новай супольнасці людзей, а затым мелася на ўвазе стварэнне адзінага сусветнага грамадства з сацыялістычнай і камуністычнай арыентацыяй [9, с. 543]. Усё гэта і перадумовіла сацыяльна-эканамічнае становішча і эвалюцыю рэлігійных абшчын нацыянальных меншасцей Беларусі ў працэсе станаўлення і развіцця БССР у перыяд студзень 1919–верасень 1939 гг.

Аб’ектам нашага даследавання з’яўляліся рэлігійныя абшчыны нацыянальных меншасцей Беларусі. Прадмет даследавання – стан, дзейнасць і эвалюцыя рэлігійных арганізацый нацыянальных меншасцей у міжваенны перыяд Савецкай Беларусі. Нацыянальныя меншасці – гэта групы насельніцтва пэўнай нацыянальнасці, якія расселены ў іншанацыянальным асяроддзі па-за межамі ўласных дзяржаўных утварэнняў або не маюць такіх. Ствараюць этнакультурную супольнасць, якая пэўным чынам інтэгруецца з тытульнай большасцю.

У выніку апрацоўкі архіўных матэрыялаў і апублікаваных прац [2–4; 7; 8; 10–12; 13; 18; 19; 22; 23] намі праведзена даследаванне партыйнай і савецкай дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да рэлігійных абшчын нацыянальных меншасцей, сацыяльна-эканамічнага становішча, функцый, сацыяльнага складу і матэрыяльнай базы рэлігійных абшчын нацыянальных меншасцей Беларусі, формы і метады іх па-за культавай дзейнасці ў 1920–1930-я гг. [1; 14–16; 17; 20; 21].

У выніку можна сцвярджаць наступнае. У 1920-я гг., нягледзячы на палітычны і сацыяльны ціск з боку органаў савецкай улады, рэлігійныя абшчыны іўдзейскага, каталіцкага і пратэстанцкага веравызнання, якія існавалі ў месцах кампактнага пражывання асоб польскай, латышскай, літоўскай, нямецкай, яўрэйскай і рускай нацыянальнасці, знаходзілі магчымасці для свайго функцыянавання.

Устаноўлена залежнасць паміж асаблівасцямі правядзення палітыкі беларусізацыі і рэлігійнага жыцця нацыянальных меншасцей. Фактарам актывізацыі рэлігійнага жыцця нацыянальных меншасцей была палітыка беларусізацыі, якая не

толькі актывізавала дзейнасць тытульнага этнасу, але і стымулявала нацыянальную і рэлігійную актыўнасць этнічных груп. Адначасова са згортваньнем палітыкі беларусізацыі ў канцы 1920-х гг. назіралася пагаршэнне становішча рэлігійных нацыянальных абшчын.

Асаблівасцю перыяда станаўлення і развіцця БССР з’яўлялася тое, што ва ўмовах пабудовы савецкага грамадства, якое грунтавалася на суцэльным падпарадкаванні камуністычнай ідэалогіі і ўсталяванні атэістычнага (матэрыялістычнага) светапогляду, рэлігійнае жыццё абшчын у 1920–1930-я гг. стала той сферай, дзе захоўваліся прыкметы, рысы і асаблівасці традыцыйнай культуры нацыянальных меншасцей. Прасочваецца гістарычная заканамернасць, якая складалася ў тым, што ва ўмовах ганенняў, арыштаў адбываецца згуртаванне веруючых на этнічнай аснове. Немцы, палякі, латышы, літоўцы не толькі не адракліся ад рэлігіі, але яна яшчэ больш кансалідавала іх. Сярод нацыянальных меншасцей яшчэ больш умацоўваецца сувязь рэлігійных перакананняў з нацыянальнай ідэнтычнасцю.

Каб супрацьпаставіць рэлігійнай культуры свецкую, партыйна-дзяржаўным кіраўніцтвам ствараліся нацыянальныя формы культуры і адукацыі. Улада не мірылася з рэлігійнасьцю дарослых і ўсяляк выкраняла яе ў моладзі. Па сапраўднаму ваяўнічы характар антырэлігійнай барацьба прыняла ў канцы 1920–пачатку 1930-х гг. Указанні аб узмацненні барацьбы даваліся рэгулярна ад розных дзяржаўных і партыйных органаў і з markрознай нагоды.

Правядзенне калектывізацыі парушыла традыцыйны ўклад жыцця нацыянальных меншасцей БССР. Савецкая ўлада бачыла ў калектывізацыі асноўны сродак пераходу да камуністычнага грамадства вясковага насельніцтва, у якім не павінна было быць месца рэлігіі. Аднак у 1930-я гг., нягледзячы на антырэлігійную прапаганду, рэпрэсіі ў адносінах да актыву абшчын і святароў, рэлігійныя перакананні (вераванні) былі часткай жыцця насельніцтва ў нацыянальных калгасах БССР. Адзначалася значная рэлігійнасць сярод калгаснікаў яўрэйскіх і інтэрнацыянальных калгасаў. У многіх калгасах захоўваліся малельні, калгаснікі не працавалі па суботах і падчас рэлігійных святаў, выраблялі мацу, карысталіся паслугамі рэзніка.

Гвалтоўнае правядзенне калектывізацыі ў Савецкай Беларусі актывізавала прыхаваную і адкрытую па-за культавую дзейнасць веруючых у асяродку нацыянальных меншасцей. Калгасны лад быў не сумяшчальны з глыбокай рэлігійнасьцю латышскага, літоўскага, нямецкага, польскага і часткова рускага (стараверы) насельніцтва, якое жыло ў вёсках Беларусі.

Веруючыя не выступалі ў якасці пасіўных сведкаў падзей, якія адбываліся па ініцыятыве камуністычнай улады. Узмоцненая абмежавальна-рэпрэсіўная палітыка, якая праводзілася ў дачыненні да рэлігіі і царквы, выклікала адкрыты і латэнтны супраціў абшчын нацыянальных меншасцей. Рэлігійны актыў з’яўляўся ініцыятарам і арганізатарам супрацьстаяння значнай часткі прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей афіцыйнаму гвалту ўлады. Шырока выкарыстоўваліся наступныя формы і метады па-за культавай дзейнасці: тлумачэнне і сістэматызацыя рэлігійных ідэй, місіянерская, дабрачынная, выхаванне ў сям’і, па захаванню прынцыпаў і правілаў жыцця, кіраўніцтва і дзейнасць рэлігійных арганізацый, асветная, адукацыйная.

На працягу 1930-х гг. колькасць зарэгістраваных і не зарэгістраваных абшчын і веруючых пачынае няўхільна зніжацца, што звязана з актывізацыяй работы органаў савецкай улады па выкараненню рэлігійных вераванняў і ўяўленняў, узмацненнем антырэлігійнай прапаганды, сацыяльнымі зменамі ў грамадстве. Калі ў сярэдзіне 1920-х гг. назіралася пэўная актывізацыя рэлігійнага жыцця нацыянальных меншасцей, то рэзкае пагаршэнне становішча рэлігійных абшчын пачалося з канца дзесяцігоддзя, калі ўзмацнілася канфрантацыя дзяржавы з царквой. Асноўным фактарам змяншэння колькасці рэлігійных абшчын нацыянальных меншасцей у 1930-я гг. стала рэпрэсіўная палітыка савецкай улады ў дачыненні да рэлігіі і царквы. Іншыя фактары, у т. л. пагаршэнне матэрыяльнага стану членаў абшчын, з-за чаго касцёлы, цэрквы, кірхі, сінагогі і малітоўныя дамы немагчыма было адбудаваць пасля пажара ці адрамантаваць, былі безумоўна другаснымі.

Адным з кірункаў абмежавання ўплыву абшчын нацыянальных меншасцей стаў фінансавы ціск на святароў. Работнікі нізавых фінансавых органаў Наркамфіна пры абкладанні служыцеляў культу не лічыліся з іх рэальнымі магчымасцямі. На працягу ўсяго дзесяцігоддзя назіраліся сістэматычныя і часцей за ўсё паспяховыя

спробы перадачы культавых збудаванняў у рукі органаў улады або гаспадарчых суб'ектаў для размяшчэння установ культуры або выкарыстання ў гаспадарчых патрэбах. Ва многіх выпадках гэта быў прамы захоп маёмасці вернікаў, бо праводзіўся ён без юрыдычнага афармлення дзеянняў улады.

Іудзейскія рэлігійныя абшчыны прыпынялі сваю дзейнасць павольней, чым праваслаўныя, некалькі даўжэй захоўвалі свае культавыя будынкі, праяўлялі вялікую вынаходлівасць для самазахавання ў самых цяжкіх умовах савецкай рэчаіснасці.

Адначасова варта падкрэсліць, што антырэлігійная палітыка КП(б)Б і ўрада БССР у поўнай меры не дасягнула пастаўленых мэтаў. Пэўная частка насельніцтва працягвала ўдзельнічаць у набажэнствах, шанаваць рэлігійныя святы і прытрымлівацца рэлігійных традыцый. Практычна ва ўсіх гарадах, мястэчках і ў некаторых вёсках БССР у першай палове 1930-х гг. працягвалі існаваць рэлігійныя абшчыны нацыянальных меншасцей. Не апраўдалася надзея камуністычнай улады і на тое, што новыя савецкія святы паступова заменяць традыцыйныя рэлігійныя. Рэлігійныя святы адзначаліся значнай часткай латышскага, нямецкага, польскага, рускага і яўрэйскага насельніцтва БССР. Уплыў рэлігіі выразна прасочваўся ва ўсіх сферах жыцця нацыянальных меншасцей. Нават члены камуністычнай партыі (бальшавікоў) з ліку нацменшасцей не цураліся рэлігійнай абраднасці.

Сацыяльная база рэлігійных абшчын нацыянальных меншасцей найбольш адпавядала традыцыйным заняткам прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей. Напрыклад, сярод іўдзеяў пераважалі жыхары гарадоў і пасёлкаў: рамеснікі, беспрацоўныя, рабочыя, саматужнікі і гандляры, а сярод латышоў, немцаў, літоўцаў, старавераў (рускіх) – сяляне.

Новая хваля актывізацыі па-за культавай дзейнаці рэлігійных абшчын нацыянальных меншасцей была выклікана падрыхтоўкай і прыняццем Канстытуцый СССР у 1936 г. і БССР у 1937 г. [5; 6], таксама правядзеннем Усесаюзнага перапісу насельніцтва, які праводзіўся з 15.10.1936 па 12.01.1937. У часткі насельніцтва ўзніклі ілюзійныя ўяўленні аб магчымасці ажыццяўлення свабоды сумлення і нават аб вяртанні храмаў веруючым. Падчас правядзення перапісу насельніцтва гэта выявілася ў значна большым, чым

разлічвалі ўлады працэнце людзей, якія адважыліся заявіць пра свае рэлігійныя перакананні. Аднак спробы веруючых вярнуць або не дапусціць адчужэння культавых збудаванняў і богаслужбовых рэліквій рэлігійных аб’яднанняў не мелі поспеху і рашуча перарываліся ўладамі.

Актывізацыя веруючых справакавала новую хвалю рэпрэсіўных дзеянняў у адносінах да рэлігійнага актыву і святароў з боку партыйна-савецкага кіраўніцтва. У другой палове 1930-х гг. пачаўся рашучы наступ супраць рэлігіі. У выніку рэлігійныя абшчыны нацыянальных меншасцей засталіся без святароў і актыву, што дазволіла цалкам забраць культавую маёмасць (пабудовы) у дзяржаўную ўласнасць. Матэрыяльная база абшчын перастала адпавядаць патрэбам рэлігійнага жыцця. Спробы рэлігійных абшчын нацыянальных меншасцей прыстасавацца да савецкай рэчаіснасці аказаліся беспаспяховымі. Тым не менш, вынікам дзейнасці абшчын нацыянальных меншасцей у БССР трэба лічыць захаванне асноўных рэлігійных традыцый на працягу першых двух дзесяцігоддзяў панавання Савецкай улады.

**Выкарыстаная літаратура**

1. Агееў, А.Р. Спробы прыстасавання іўдзейскіх абшчын Магілёўскай акругі да ўмоў савецкай рэчаіснасці ў 1920-я гады / А.Р. Агееў // Религия и общество – 9: сборник научных статей / под общ. ред. В.В. Старостенко, О.В. Дьяченко. – Могилев: МГУ имени А.А. Кулешова, 2015. – С. 5–7.

2. Жук, В.Н. Религиозно-общественные объединения католиков-поляков и антирелигиозная работа во второй половине 1920-х гг. в БССР / В.Н. Жук // Беларускі археаграфічны штогоднік. – Мінск, 2006. – Вып. 7. – С. 215–224.

3. Канфесіі на Беларусі (к. XVIII–XX стст.) / В.В. Грыгор’ева, У.М. Завальнюк, У.І. Навіцкі, А.М. Філатава; Навук. рэд. У.І. Навіцкі. – Мінск: ВП Экаперспектыва, 1998. – 340 с.

4. Карпекін, К.Р. Змены ў становішчы іўдзейскага культу ў БССР ва ўмовах савецкай антырэлігійнай прапаганды (1919–1939 гг.) / К.Р. Карпекін // Беларускі гістарычны часопіс. – 2012. – № 8. – С. 32–39.

5. Конституция (Основной Закон) Белорусской Советской Социалистической Республики. – Минск: БЕЛПАРТИЗДАТ ЦК КП(б)Б, 1937. – 32 с.

6. Конституция СССР 1936 г. // Кукушкин, Ю.С. Очерк истории Советской Конституции / Ю.С. Кукушкин, О.И. Чистяков. – М.: Политиздат, 1987. – С. 285–313.

7. Лебедев, А. Костел и власть на Гомельщине (20–30-е годы XX в.). – Варшава-Люблин-Гомель: Институт национальной памяти, Институт Центрально-Восточной Европы, 2009. – 470 с.

8. Навіцкі У. Разгром рэлігійных арганізацый // Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 5: Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішевіч [і інш.]; рэдкал. М. Касцюк (гал. рэд.) і інш. – Мінск: Экаперспектыва, 2007. – С. 328–335.

9. Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: XX стагоддзе / М.П. Касцюк [і інш.]; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]; Нац.акад.навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларус.навука, 2008. – 615 с.

10. Опиок, Т.В. Атеистическая работа с латышским населением Могилевского округа в 1920-е гг. / Т.В. Опиок // Религия и общество – 8: сб. науч. статей / под общ. ред. В.В. Старостенко, О.В. Дьяченко. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2014. – С. 26–28.

11. Пасталоўскі, С.А. Стараабрадцы як частка рускага этнасу на Гомельшчыне ў 20–30-я гг. XX ст. / С.А. Пасталоўскі // Творчество молодых 2002. Сб-к научных работ студентов и аспирантов УО “Гомельский государственный унив-т имени Ф. Скорины”. – Гомель, 2001. – С. 196–197.

12. Пичуков, В.П. Лютеране и “сектанты”: сельские немцы белорусского Восточного Полесья в 1920–30-е гг. / В.П. Пичуков // Канфесіі на Беларусі: гісторыя, сучаснасць. Зборнік матэрыялаў міжнароднай навукова-практычнай канф. – Брэст, 2005. – С. 207–211.

13. Пичуков, В.П. Религиозный актив немецкой диаспоры белорусского восточного Полесья (20–30-е годы XX в.) / В.П. Пичуков // Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа: зб. навук. арт.: у 2 ч. Ч. 2 / ГрДУ імя Я. Купалы; рэдкал.: Э.С. Ярмусік [і інш.]. – Гродна : ГрДУ, 2009. – С. 43–48.

14. Пушкін, І.А. Асаблівасці фарміравання і развіцця нацыянальна-дзяржаўнай палітыкі БССР у 1920-я гг. / І.А. Пушкін // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А. Куляшова. Серыя А. Гуманітарныя навукі. – 2014. – № 2. – С. 10–15.

15. Пушкін, І.А. Нацыянальна-дзяржаўная палітыка ў БССР (1920–1930-я гг.) / І.А. Пушкін // Гістарычна–археалагічны зборнік. – Мінск: Беларуская навука, 2015. – Выпуск 30. – С. 151–160.

16. Пушкін, І.А. Пратэстанцкія рэлігійныя абшчыны ў асяродку нацыянальных меншасцей БССР у міжваенны час / І.А. Пушкін // Религия и общество – 8: сборник научных статей / под общ. ред. В.В. Старостенко, О.В. Дьяченко. – Могилев: УО "МГУ им. А.А. Кулешова", 2014. – С. 62–64.

17. Пушкін, І.А. Рэлігійнасць вучняў нацыянальных савецкіх школ у 1920–1930-я гг. / І.А. Пушкін // Религия и общество – 10: сборник научных статей / под общ. ред. В.В. Старостенко, О.В. Дьяченко. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2016. – С. 312–314.

18. Романова, И. Политика большевиков в отношении национальных меньшинств в Беларуси в межвоенный период / И. Романова // Ethnic Culture: Traditions and Innovations. – Kaunas, 2004. – С. 340–347.

19. Трубчик, Е.Г. «Этничность» и «костёльность» населения белорусско-польских деревень БССР в межвоенный период / Е.Г. Трубчик // Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа : зб. навук. арт.: у 2 ч. Ч. 2 / ГрДУ імя Я. Купалы; рэдкал.: Э.С. Ярмусік [і інш.]. – Гродна : ГрДУ, 2009. – С. 27–30.

20. Юдин, В.В. Законодательство о религии и церкви в Советской Белоруссии (1919–1929) / В.В. Юдин // Религия и общество – 9: сборник научных статей / под общ. ред. В.В. Старостенко, О.В. Дьяченко. – Могилев: МГУ имени А.А. Кулешова, 2015. – С. 42–44.

21. Юдин, В.В Становление правового обеспечения политики советской власти в отношении религии и церкви (1917–1918) / В.В. Юдин // Этнічная, моўная і культурная разнастайнасць у сучасным грамадстве: зборнік навуковых прац удзельнікаў Міжнар. навук.-практ. канф., 29–30 мая 2014 г., г. Магілеў / Маг.

дзярж. ун-т харч.; уклад І.А. Пушкін; рэдкал.: Ю.М. Бубнаў (адк. рэд) [і інш.]. – Магілеў: МДУХ, 2014. – С. 312–316.
22. Янушевич, И.И. Конфессиональная ситуация в Беларуси в 1917–1941 гг. / И.И. Янушевич // Беларуская дзяржаўнасць: вопыт ХХ стагоддзя: матэрыялы Міжнар.навук.-тэарэт.канф., Мінск, 18–19 крас. 2003 г. – Мінск: БДПУ, 2004. – С. 188–190.
23. Dzwonkowski, Roman. Kościoi Katolicki w ZSSR 1917–1939. Zarys historii / Roman Dzwonkowski. – Lublin: Towarzystwo Naukowe katolickiego Uniwiersytetu Lubelskiego, 1997. – 477 s.

## Национальный образ белорусов (по мотивам творчества Г. Д. Гачева)

Семёнова Л. Н. г. Минск, БНТУ

Моруа А. как-то заметил, что толковое жизнеописание встречается куда реже, чем толком прожитая жизнь. Продолжая эту мысль, можно сказать, что толковых описаний народов так же встречается гораздо меньше, чем самих народов. Между тем народоописание, лежащее в основе этнологии как таковой, чрезвычайно необходимо как для самоидентификации, так и для понимания других народов. Описания должны охватывать весь спектр материальной и духовной культуры. В описании внешних проявлений народного творчества, таких как: хозяйство, зодчество, кулинария, костюм, игры, обряды, верования, мифы, песни, танцы, музыка, сказания и т. д. по всем известным этносам накоплен значительный и масштабный материал. Однако, характеристика внутреннего содержательного наполнения этого творчества, способов и стилей мышления, представлений о мироздании, всего того, что удачно отражается в понятии ментальность, чаще встречается в качестве теоретической постановки проблемы, нежели практики прикладного описания. Постижение глубин народного сознания подвластно немногим мыслителям.

В основном эту тему поднимали исследователи культур и цивилизаций, такие, как: Н. Данилевский, А.Дж. Тойнби, М. Вебер. Такое постижение удалось осуществить О. Шпенглеру, установившему взаимоотношения между морфологией мировой истории и философией, действительностью и образами человеческого